# Дапаможам убраць ураджай!

## Змагаемся за дысцыпліну

Другі курс аддзялення журналістыкі працуе ў 4 брыгадзе калгаса імя Красіна. У групе 26 чалавек. З першага дня мы імкнемся да арганізаванасці ў працы. Праўда, пакуль мы былі заняты на стагаванні, ачыстцы збожжа і іншых работах, дысцыпліну праявіць было цяжка, таму што мы былі раздроблены. Некалькі дзён назад мы прыступілі да копкі бульбы. Брыгадзір адмераў нам 20 гектараў, якія мы павінны ўбраць за час прабывання ў калгасе.

Працуючы ў адной брыгадзе, мы ясна ўбачылі, хто працуе добра, а хто дрэнна. Першы дзень працаваць было цяжка. Без прывычкі балела спіна, ногі. Але хутка усе прывычаіліся. З першых-жа дзён сталі добра працаваць Э. Луканская, Ф. Савіцкі, Н. Няхай, Г. Нушкова і іншыя. Трэба адзначыць і тое, што С. Ляпесін які ў мінулым годзе, не зусім вызначаўся ў працы, за што яго крытыкаваў універсітэцкі друк, у гэтым годзе працуе нават вельмі добра і можа служыць прыкладам для іншых. А. Фралоў, якога таксама крытыкавалі ў мінулым годзе, у гэтым годзе таксама справіўся і не адстае ад іншых.

Нажаль, сустракаюцца яшчэ прыклады дрэнных адносін да працы. Але на ўсякае парушэнне дысцыпліны група хутка рэагуе. Так, аднойчы нам засталося ўбраць некальокі буртоў бульбы. Праўда, рабочы дзень ужо канчаўся. Мы ўсе засталіся, а Гнедзіна і Булгакова пайшлі дахаты. Уся група абурылася. Увечары ўсе сабраліся, запрасілі іх і пагутарылі з імі. Яны адчулі сваю віну. І каб даказаць, што яны сумленна жадаюць працаваць, назаўтра сталі па адной у рад, у той час, як астатнія працавалі па два чалавекі ў кожным радзе. Студэнт Клебанаў таксама дрэнна працаваў. Адставаў ад усіх, імкнуўся стаць з кім-небудзь у адзін рад, рабіў усё, каб менш працаваць. Ідучы дахаты, уся група рэзка раскрытыкавала яго паводзіны. Трэба думаць, ён хутка будзе ў ліку перадавых.

Група сур'ёзна адносіцца да работы, і можна спадзявацца, што яна добра дапаможа калгасу ва ўборцы ўраджаю.

Л. АБУШЭНКА,
*студэнт IV курса аддзялення журналістыкі.*



З аганьком працуюць на ўборцы кукурузы студэнты III курса хімічнага факультэта. Яны рашылі дапамагчы калгаснікам стварыць для жывёлы трывалую кармавую базу, поўнасцю забяспечыць яе на ўвесь стойлавы перыяд сакавітымі кармамі.

*На здымку:* Студэнтка Ала Кавалеўская на жніве кукурузы.

## Калгасны вартаўнік

Дрэвы прызадумаліся пад цяжарам даспяваючых пладоў.

З ружжом за плячыма, удзень і ўночу, у добрае і дрэннае надвор'е ахоўвае калгасны сад студэнт III курса гістарычнага факультэта Генадзій Ватковіч.

*А. ГАЎРЫЛАЎ.*

## У першай брыгадзе

Нізка навісла над палеткамі затканае шэрымі хмарамі неба. Час-ад-часу налятае вецер, зрывае з галін пажоўклыя ужо лісты і гоніць па чорнай раллі гэтых першых веснікаў наступаючай восені. Калі-ні-калі імжыць—веецца праз нябачанае сіта дробны, быццам пытляваны дождж. Усё гэта гаворыць, што восень блізка, што яна ўжо наступіла. А ў калгасе «Перамога» на корані стаяў яшчэ лён. Не была ўбрана грэчка, калгаснікі выкапалі менш гектара бульбы. У гэты напружаны час заканчэння сельскагаспадарчага года на дапамогу хлебаробам прышлі студэнты нашага універсітэта.

...Першая паляводчая брыгада. Адразу-ж за вёскай пачынаюцца бульбяныя плантацыі. Тут працуе чацверты курс аддзялення матэматыкі. Хутка рухаюцца ўздоўж барознаў рознастайна апранутыя фігуры. Не паспееш азірнуцца, як кошык ужо напоўнен белымі, буйнымі клубнямі. Моцныя рукі хлопцаў падхопліваюць кошыкі і высыпаюць іх у фуры, якія рухаюцца услед за выбіраючымі. У такім «тэмпе» дзяўчаты праходзяць адну-дзве-тры-чатыры баразны. Нарэшце, у канцы пятай баразны нехта не вытрымаў і ўзмаліўся:

— Дзяўчаткі, і адпачыць-жа трэба.

Дзесяціхвілінны перапынак. Усе з задавальненнем кідаюцца на зямлю, не зварочваючы ні якай увагі на мокрую траву. Нягледзячы на стому, чуваць жарты, успыхвае вясёлы смех. Дзяўчаты шчыра захапляюцца працай сваёй сяброўкі Тамары Філончык.

— Дзіва што так стамляешся, — «абураецца» невысокая чарнявая дзяўчына.—Тамара як вырвецца ўперад, то паспрабуй тады дагнаць яе.

І сапраўды, Тамара Філончык працуе з камсамольскім аганьком, з маладым задорам. Не адстаюць ад яе Аня Астроўская і Зіна Дрозд. Цяжка дагадзіць брыгадзіру Аляксандру Нікалаевічу Варанько, строгаму і нават крыху прыдзірліваму, пажылому чалавеку. Але і ён нічога дрэннага не можа сказаць пра іх працу.

— Ого, каб усе так рабілі,—Аляксандр Нікалаевіч задаволена круціць галавой,—праз тыдні два бульбу і ўпарадкавалі-б.

— І так няма чаго грашыць,—перабівае яго фурман.—Ўчора амаль усе студэнткі абагналі нашых жанчын, хоць яны і не звыклыя да такой работы. І фурман меў рацыю. Усе чацверакурсніцы выконваюць устаноўленую дзённую норму выпрацоўкі: пяць сотак. За першыя пяць дзён работы ў калгасе яны выбралі больш сямі гектараў бульбы. Пры гэтым трэба ўлічыць, што першыя два дні на копцы бульбы працавала ўсяго 10 студэнтаў. Астатнія 17 церабілі лён.

— Я раней бачыла толькі, як расце лён, — смяецца Іна Шульц,—а як яго церабяць, нават і не ведала.

Іна—комсорг групы, і ёй не выпадае адставаць ад сяброўак, Нараўне з іншымі яна выцярэблівала па 8—10 сотак ільну ў дзень.

З дапамогай студэнтаў церабленне ільну ў калгасе было завершана.

У той час, як дзяўчаты выбіраюць бульбу, хлопцы заняты на іншых работах. Частка іх ачышчае і рамантуе сіласныя ямы і траншэі, частка звозіць у калгасныя такі салому, якая засталася на полі пасля камбайнавай уборкі. Тут прыклад у працы паказваюць «абодвы Нікалаі», як іх называюць на курсе: Нікалай Лукашэвіч і Нікалай Кеда.

А вось Нікалай Рыняк пайшоў іншай дарогай. Паслаў брыгадзір Варанько на пагрузку саломы пяць чалавек. Пад вечар наведаў іх. Трэба-ж гаспадару ведаць, як хто працуе. Здзіўлены Александр Нікалаевіч убачыў толькі чатырох хлопцаў, якія нагружалі салому на аўтамашыну.

— Дзе-ж ваш пяты таварыш?—запытаўся ён.

Працуючыя пераглянуліся, засмяяліся.

— Не ведаем,—адказалі.

Але тут чуткае вуха брыгадзіра ўлавіла з-за капы невядомыя гукі. Зайшоў Нікалай Аляксандравіч за капну і бачыць—спіць Нікалай Рыняк моцным сном, як пшаніцу прадаўшы. Толькі носам пасвіствае ды губамі прычмоквае. З цяжкасцю дабудзіўся яго брыгадзір. Гультай быў непрыемна здзіўлены тым, што яго таварышы яшчэ не закончылі работу.

Усе студэнты паасобку асуджаюць паводзіны Нікалая Рыняка.

— Калі два працуюць,—з абурэннем гавораць адны,—а ён будзе трэці, то абавязкова ўхіліцца ад работы.

— Гэта-ж трэба дадумацца, — падтрымліваюць іх другія,—калі ўсе працуюць, ён стаіць і толькі наглядае.

Але гэта ўсё-ж паасобныя размовы, асуджэнне «за вочы». А з Рыняком пара пагаварыць грамадскасці курса. Гэта справа комсамольскай і профсаюзнай арганізацый.

...Восенню хутка і неўзаметку падкрадаецца вечар. Вось ужо і сцямнела. Стала немагчыма адрозніваць клубні ад чорнай зямлі. Толькі цяпер студэнты пакідаюць поле. Іх чакае смачная вячэра.

Шмат было сёння клопатаў дзяжурным па кухні Тамары Садоўскай і Раі Сямёнавай. Гэта-ж трэба накарміць цэлую групу студэнтаў, якія, дарэчы, пасля працоўнага дня не скардзяцца на дрэнны апетыт.

А пасля вячэры ў клубе чуюцца гукі музыкі. Задорныя мелодыі полькі змяняюцца вясёлымі факстротамі, плаўнымі танго і вальсамі. Будучыя педагогі ўмеюць папрацаваць, умеюць і павесяліцца.

*А. БАЛАШ.*
*Вёска Калодзішчы, Мінскі раён.*

## Поспехі нашай групы

Дружна працуюць на ўборцы бульбы ў калгасе імя Варашылава Мінскага раёна студэнты 1-га курса рускага аддзялення. Старанная работа дае добрыя вынікі. За дзень яны выбіраюць больш чым па 2 га бульбы. Каб лепш выконваць свае дзённыя нормы выпрацоўкі, уся група разбілася на шэсць рабочых брыгад, якія спаборнічаюць паміж сабой. У 8 гадз. 30 м. раніцы брыгады збіраюцца на полі і размяркоўваюць сабе ўчасткі. Унутры брыгад пануе пачуццё калектывізма і ўзаемадапамогі. Працуюць дружна, зладжана, з вясёлай песняй. У залежнасці ад выпрацоўкі канчаецца і рабочы дзень у брыгадах. Адны ўжо перавыканалі сваю дзённую норму і ідуць на адпачынак, другія яшчэ заканчваюць работу. У канцы дня брыгадам паведамляюцца вынікі іх работы за дзень. Гэта дае магчымасць лепш спланаваць работу на заўтра. Добра працуе 2-ая брыгада, акуратнасцю і дружбаю ў рабоце вылучаецца 3-яя брыгада.

Прыклад у працы паказваюць студэнты Кожан, Астаповіч, Пісарэнка, Акуліч і др. Студэнты выконваюць і перавыконваюць свае дзённыя нормы. Праўленне калгаса задаволена работай групы.

Студэнты добра разумеюць, што дапамога калгасу ў такі адказны час уборкі — іх пачэсны і высакародны абавязак.

*А. ПЕТКЕВІЧ,*
*кіраўнік групы.*

## На ўборцы саломы і гуркоў

Некаторыя кіраўнікі груп лічаць за лепшае толькі кіраваць. Яны важна пахаджваюць, даюць указанні. Другога метаду прытрымліваецца Аляксандр Ігнаценка. Ён паспявае пабываць ва ўсіх брыгадах, дзе ёсць яго студэнты, даведацца пра іх патрэбы. Знаходзіць ён час і разам са студэнтамі папрацаваць. Вось ён падае салому на воз Каспіровічу Алегу. Яны ўдваіх возяць яе да буртоў.

Студэнты III курса гістфака Людміла Ягорава, Зіна Валькoвіч, Тамара Елісеева добра працуюць на ўборцы гуркоў.

## БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ!

Нікалай Рыняк рашыў у рабочы час выспацца ў капне саломы.



*Брыгадзір: — Уставай, уставай!*
*Н. Рыняк: —Яшчэ не выспаўся!*
*Брыгадзір: — Ідзі дапамажы сваім таварышам.*
*Н. Рыняк: — А ці яны яшчэ не закончылі?*

Лена Панасюк і Аня Шыкіна своечасова не з'явіліся на работу.




*— Гэта мы не прывыклі ўставаць рана, таму на аўтобус спазніліся...*

Анатоль Мядзведзеў студэнт IV курса адз. журналістыкі без усякай прычыны не паехаў працаваць у калгас.



*— Чаго сядзіш дома?*
*—Англійскую мову здаваць буду.*
*— А чаму не рыхтуеш?*
*— Ды хутка на бульбу паеду.*

# У БАРАЦЬБЕ ЗА СЕКУНДЫ

—На старт! Увага! — сціснуты ў паднятай руцэ старцёра пісталет можа кожны момант выстраліць... Пяць смуглых мускулістых юнакоў у чаканні гэтага моманту замерлі на месцы. Раздаўся выстрал. Бегуны рынуліся ўперад. З імклівай хуткасцю яны амаль адначасова праходзяць палавіну дыстанцыі. Але вось уперад выходзіць спартсмен у чырвонай майцы. На апошніх метрах — рывок... і лінія фінішу пройдзена. Перамога! Апладысменты шматлікіх гледачоў перашкаджаюць пачуць па радыё голас дыктара, які аб'явіў, што Уладзімір Ціток у фінальным забегу на 100 метраў атрымаў упэўненую перамогу з новым рэкордам універсітэта.

Уладзімір Ціток паступіў на гістарычны факультэт універсітэта ў 1952 годзе. З першых дзён вучобы ён з'яўляецца дысцыплінаваным і ўдумлівым студэнтам. Сістэматычна наведваючы лекцыі, старанна рыхтуючыся да заняткаў на працягу ўсяго года, Уладзімір дабіваецца таго, што амаль усе яго адказы на семінарах і экзаменах адзначаліся выдатнай адзнакай.

Ведаюць Уладзіміра і як добрага грамадскага актывіста. Увесь мінулы год, будучы членам факультэцкага бюро, ён узначальваў фізкультурную работу на факультэце. У гэтым навучальным годзе студэнты зноў выбралі свайго лепшага таварыша ў комсамольскае бюро гістфака.

У вольны ад заняткаў час Уладзімір любіў пагуляць у валейбол, баскетбол.

Аднойчы, калі яшчэ Ціток займаўся на I курсе, да яго падыйшоў вядомы ў Мінску лёгкаатлет, студэнт гістарычнага факультэта Анатоль Паўлючэнка і спытаў:

—Ты калі-небудзь раней бегаў?

—Так. У школе даводзілася ўдзельнічаць у спаборніцтвах па бегу, кіданню дыска і кап'я,—



збянтэжыўшыся, адказаў першакурснік.

—Згадзішся бегаць з намі ў эстафеце?

І Уладзімір згадзіўся.

З гэтага часу Уладзіміра рэгулярна можна было сустрэць на занятках секцыі кідання. За год трэніровак ім былі адноўлены амаль усе старыя рэкорды універсітэта па кіданню кап'я, гранаты, дыска. Ён становіцца чэмпіёнам універсітэта па розных відах спорту.

Аднойчы неяк у час заняткаў лёгкаатлетаў трэнер, майстар спорту В. Кушнароў звярнуўся да яго:

—Слухай, Валодзя, ці не перайсці табе займацца ў групу стрынцераў? Там ты змог-бы дабіцца значна лепшых вынікаў.

Уладзімір пачаў трэніравацца ў бегу на 100 і 200 метраў. Пад кіраўніцтвам здольнага выкладчыка Уладзіміра Грыгор'евіча Кушнарова Ціток дабіўся новых поспехаў. Многа давялося папрацаваць вучню і трэнеру над мэтанакіраванасцю сілы задняга штуршка, ад якога ў многім залежыў тэмп бегу. З вялікай настойлівасцю Уладзімір выконваў парады Кушнарова і паступова выпрацоўваў правільную схему бегу. З гэтага і пачаўся штурм старых рэкордаў у бегу на 100 і 200 метраў.

Ужо ў мінулым годзе рэкорд універсітэта ў бегу на 100 метраў быў роўны 11,4 секунды. Усю мінулую зіму і вясну Уладзімір пад кіраўніцтвам В. Кушнарова адпрацоўваў якасці, неабходныя спрынцеру: хуткасць, сілу, вынослівасць. Частыя кросы на вуліцы і ў парках, а ў зале выкананне агульнаразвіваючых гімнастычных практыкаванняў, апрацоўка нізкага старту садзейнічалі больш гарманічнаму фізічнаму развіццю.

Летам на першых спаборніцтвах Уладзімір паказвае вынік 11,4—11,6 секунды. Тады-ж ва ўпорнай барацьбе ён заваёўвае другое месца сярод беларускіх студэнтаў, устанавіўшы новы рэкорд БДУ — 11,3 секунды — і выходзіць пераможцай некалькіх спартыўных спаборніцтваў.

...Адной з цэнтральных падзей спартыўнага жыцця Мінска летам гэтага года была спартакіяда профсаюзаў. На старт фінальнага забегу на 100 метраў побач з рэкардсменам рэспублікі Міхальчуком, Яфімавым, Леонавым выйшаў і Уладзімір Ціток. У той дзень Уладзімір атрымаў яшчэ адну перамогу. Услед за спартакіядай на абласным фестывалі моладзі ў паказальным забегу суддзі фіксіруюць новы рэкорд універсітэта 11,2 секунды, устаноўлены Уладзімірам Ціткам.

У верасні Уладзімір і яго сябра Увараў былі ўключаны ў склад зборнай каманды горада, гонар якой з поспехам абаранілі на рэспубліканскіх спаборніцтвах, якія адбыліся нядаўна ў Мінску. А цяпер, пасля насычанай спаборніцтвамі летняй пары, Уладзімір разам з некаторымі студэнтамі нашай навучальнай установы рыхтуецца абараняць гонар таварыства «Буравеснік» на Усесаюзных спаборніцтвах, якія адбудуцца ў Одэсе.

Так прадаўжаецца барацьба за секунды і іх дзесятыя.

*О. УХАНАЎ.*

## НАШ КАЛЯНДАР

# ВЯЛІКІ РУСКІ МАСТАК

*(ДА 25-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ І. Е. РЭПІНА).*

І. Е. Рэпін нарадзіўся ў горадзе Чугуеве—украінскім ваенным пасяленні. У хлопчыка рана паявіліся схільнасці да жывапісу. Першыя мастацкія пазнанні ён атрымаў у мясцовай школе ваенных тапографаў, затым навучаўся і працаваў з жывапісцам Бунаковым. Увесь гэты час Рэпін марыў аб тым, каб паехаць у Пецербург, паступіць у Акадэмію мастацтваў. Гэтая мара ажыццявілася ў 1863 годзе. Аднак спачатку Рэпін паступіў у рысавальную школу і толькі на наступны год быў прыняты ў Акадэмію мастацтваў.

Першая карціна, якой праславіўся Рэпін перад сучаснікамі—«Бурлакі на Волзе» (1873 г.). Яна азнаменавала новы этап у развіцці рускага рэалістычнага мастацтва. У аснову карціны ляглі жыццёвыя ўражанні і перажыванні самога мастака.

Следуючы поглядам Чэрнышэўскага, Рэпін накіраваў сваю творчасць па шляху рэзкай крытыкі і выкрыцця ўсякіх праяўленняў сацыяльнага прыгнёту і няроўнасці.

Выдатныя палотны сялянскай тэматыкі напісаны Рэпіным у канцы 70-х—пачатку 80-х гадоў. «Ні адзін з рускіх мастакоў не змог так глыбока разумець селяніна, як Рэпін»,—пісаў Крамской.

Стасаў пісаў аб «Крыжовым ходзе»: «Гэта дастойны таварыш «Бурлакам»—тая-ж сіла, той-жа агонь, тая-ж праўда, тая-ж глыбокая нацыянальнасць... Што ні твар—то жывы тып, цалкам выхаплены з народа, што ні фігура, то характэрная».

Асноўнай думкай «Крыжовага ходу ў Курскай губерні» з'яўляецца супрацьпастаўленне двух светаў: прыгнятальнікаў і прыгнечаных. Кампазіцыйна на палатне мы бачым адзін натоўп, адзіную людскую плынь. На справе гэтая густая маса не аднародная. Што можа быць агульнага паміж апранутымі ў лапці сялянамі і заплыўшай тлушчам памешчыцай, што важна нясе вобраз? «Крыжовы ход» паказвае не толькі адмоўныя бакі царскай Расіі, але раскрывае сілу і магутнасць рускага народа, яго душэўную прыгажосць.

Рэпін быў самым шматгранным мастаком, ён адлюстроўваў на сваіх палотнах важнейшыя пытанні сучаснасці. Адной з тэм яго творчасці, побач з сялянскай, была тэма рэволюцыйная. Карціна «Не чакалі»—цэнтральны твор гэтай тэматыкі. Тэма незвычайнага паяўлення ссыльнага садзейнічала ў значнай ступені прабуджэнню рэволюцыйных ідэй. Гэтая карціна прымушае гледача думаць, дамалёўваць лёс рэволюцыянера, жыццё яго сям'і. Трывога і чаканне, вера ў светлую будучыню—вось чым прасякнута карціна «Не чакалі», у якой Рэпіну ўдалося стварыць вобраз героя рускага дэмакратычнага руху.

«Адмова ад споведзі перад пакараннем» —яшчэ адзін буйны твор, прысвечаны рэволюцыйнаму руху 70—80 гадоў. Тонкую і глыбокую характарыстыку гэтай карціне даў Стасаў у пісьме да Рэпіна: «Які позірк, якая глыбіня ў вашага асуджанага! Які характар, якое цэлае жыццё тут апісалася—кропля ў кроплю «Не чакалі».

Некалькі слоў хочацца сказаць аб палотнах І. Е. Рэпіна, што адлюстроўваюць гістарычнае мінулае. Вось жыццерадасныя «Запарожцы». Мастак захапляўся гэтымі героямі, якія аддавалі ўсе свае сілы, а часамі і жыццё абароне роднай зямлі. Вось яшчэ адна карціна з гістарычным зместам—«Іван Грозны». Гэтае палатно было народжана схваткай народавольцаў з царызмам. Карціна прасякнута палымяным гуманізмам, глыбокай чалавечнасцю. У ёй мастак прымусіў загаварыць фарбы.

Карціны Рэпіна ўзніклі на аснове вывучэння жыцця, у выніку здольнасці мастака зразумець і ацаніць з'явы рускага жыцця, адгадаць іх прычыну і ўсё гэта творча перапрацаваць. Адлюстроўваючы жыццё мінулага, карціны І.Е. Рэпіна звернуты да будучага, у іх не адчуваецца ніякага налёту ўстарэласці. Совецкага гледача яны захапляюць з яшчэ большай сілай.

*Г. МАРУНОВА.*

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

### *Падумай і адкажы*

### КЕМЛІВАСЦЬ ДАПАМАГЛА

*За ноч катлаван напоўніўся падглебавай вадой і далейшыя работы ў ім сталі немагчымымі. Што рабіць? Вёдрамі ваду хутка не вычарпаеш, насоса паблізу не было.*

*Побач працаваў экскаватар.*

*—Можа папрасіць машыніста экскаватара дапамагчы нам?—прапанаваў нехта.*

*Раздаўся смех.*

*—Гэта ўсе роўна, што рэшатам. Не выйдзе.*

*Але экскаватаршчык сам згадзіўся асушыць катлаван і праз паўгадзіны зрабіў гэта.*

*Якім чынам?*

### *З ДЗЕСЯЦІ*

*Напішыце лік сто пры дапамозе дзесяці розных лічбаў. Пры гэтым праводзіць з лічбамі якія-небудзь алгебраічныя дзеянні або пісаць іх, як дроб, нельга.*

### ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ?

*На зямным шары існуе па меншай меры 1 мільён розных відаў насякомых. Калі падлічыць усе віды астатніх жывёл і дадаць да іх усе вядомыя віды раслін, то ў суме мы атрымаем каля 700 тысяч відаў.*

*Сярод насякомых—прыкладна, 300 тысяч відаў жукоў і не менш 140 тысяч відаў матылькоў.*

### АДКАЖЫЦЕ НА ПЫТАННІ

*1. Якое насякомае тры гады жыве ў вадзе і толькі адзін дзень на зямлі?*

*2. Якая жывёла трапляе ў неймаверны страх, калі ўбачыць звярка, якога яна можа лёгка расціснуць нагой?*

*3. Адкуль родам сібірскія кошкі?*

*4. Назавіце птушку, якая ходзіць, але не лётае?*

### КРАСВОРД



*Па гарызанталі:* 5. Хор, які спявае без суправаджэння. 6. Субтрапічная расліна з смачным і араматным плодам. 8 Нервовае захворванне. 11. Горад у Еўропе. 13. Адлюстраванне здымаемага прадмета на святлоадчувальнай пласцінцы. 15. Давераная асоба, якая займаецца вядзеннем судовых спраў. 18. Расліна 21. Мужчынскае імя. 22. Аўтарытэт, уплыў. 23. Дзіцячая цацка. 24. Неажыццявімая фантазія. 29. Рэмарка ў тэксце драматычнага твора. 31. Той, хто мае схільнасць да чаго-небудзь. 32. Халодная зброя. 35. Лятальны апарат. 36. Медыцынскі прыбор. 38. Асабліва каштоўнае, запаветнае. 40. Выбар асобы. 41. Крытая галерэя з каланадай. 42. Драпежная пушная жывёла.

*Па вертыкалі:* 1. Парука. 2. Прыкрыццё ў акопах. 3. Палітычны саюз Англіі і Францыі. 4. Асвятляльнае прыстасаванне на авансцэне. 7. Пладовае дрэва. 9. Прадстаўнік, паслядоўнік філасофскага рэалізма. 10. Частка свету. 12. Перадача па радыё. 14. Галіна навукі аб жыцці жывёл. 16. Хімічны элемент. 17. Паэт-пясняр. 19. Міжнародны дагавор. 20. Кантрольная работа. 25. Паўвостраў. 26. Сістэма мерапрыемстваў з мэтаю ізаляваць якую-небудзь дзяржаву. 27. Рыбалоўная снасць. 28. Закрытая пляцоўка чыгуначнага вагона. 30. Класік армянскай літаратуры. 33 Грыб. 34. Склад зброі. 37. Бадзёры, вясёлы настрой. 39. Статак жывёлы.

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 06714 Мінск. Друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Тыраж 2000 экз. Зак. 575.